Шчодрая зямля наша Акцябрская, таму, хто жыве ўсімі яе турботамі і клопатамі, болем і радасцю, хто не адрываецца ад родных каранёў, надае сілы зямля гэта чароўная.

Хоць зараз я жыву ў Мінску, але я вельмі ўдзячна лёсу, што нарадзілася менавіта на гэтай палескай зямлі, што тут зрабіла свае першыя крокі, што адсюль павяла мяне жыццёвая сцяжынка, якая заўсёды будзе чакаць майго вяртання.

ЛІТАРАТУРА

1. Памяць. Гісторыка-дакументальная хроніка Акцябрскага раёна. – Менск: БЕЛТА, 1997. -- 478 с.

УДК 908 (476.1)

Студ. С.С. Тышкевіч
Навук. кір. дац. В.М. Астрога
(кафедра гісторыі Беларусі і паліталогіі БДТУ)

## ЛЁСАМ ЗВЯЗАНЫ З РОДНЫМ КРАЕМ (З ГІСТОРЫІ ВЁСКІ ДЗЕРАЎНАЯ СТАЎБЦОЎСКАГА РАЁНА)

Мая малая радзіма – вёска Дзераўная Стаўбцоўскага раёна. Яе назва пайшла, напэўна, ад слоў «дзёрн» або «дзірван», што перш за ўсё тут, у пушчы, азначала месца раскарчоўкі лесу. Дзераўная з'яўляецца адным з найбольш старажытных паселішчаў на Стаўбцоўшчыне. Яна вядомая з пісьмовых крыніц першай паловы XV ст. як маёнтак кашталяна віленскага Сямёна Гедыголдавіча. З 1525 г. вялікі князь літоўскі Жыгімонт І дазваляе Мікалаю Кежгайлу заснаваць у маёнтку Дзераўная мястэчка і наладзіць там торг і корчмы. Пасля смерці ў 1554 г. апошняга з Кежгайлаў, Станіслава, Дзераўная пераходзіць да іх нашчадка Яна Завішы. У канцы XVI ст. маёнтак ўяўляў сабой комплекс жылых гаспадарчых будынкаў. У сядзібным доме знаходзілася зброя, каштоўныя рэчы, кнігі. На тэрыторыі маёнтка размяшчалася верф (“сточня”) для будаўніцтва рачных караблёў. З 90-х гг. XVI ст. Дзераўная і 8 навакольных вёсак становяцца ўласнасцю Мікалая Крыштафа Радзівіла (Сіроткі). У 1646 г. у Дзераўной быў 71 двор, а сярод яе жыхароў значылася 26 рамеснікаў: цесляры, сталяры, шкляры, краўцы, млынары і іншыя. У XVIII стагоддзі на беразе Шуры стаяла шліфоўня Ганны Радзівіл. Рака прыводзіла ў дзеянне механізм мануфактуры. Замежныя і мясцовыя майстры выраблялі там каралеўскія пячаткі і аздобу для зброі. У пачатку XVIII ст. будуецца касцёл Унебаўзяцця Найсвяцейшай Дзевы Марыі. Верагодны будаўнік касцёла – віленскі канонік Войцех Сялява. Да нас дайшлі імёны народных

майстроў, цесляроў, якія будавалі гэты храм: Іван Грынцэвіч з Зарэчча, Раман з Дзяражнай, Андрэй з Ніўнага. У інтэр'еры можна адзначыць арган фірмы Ф. Вайзенборн (пач. ХХ ст.), драўляныя скульптуры «Невядомы святы» і «Укрыжаванне», абразы «Апостал Пётр» і «Тайная вячэра», разьбярны галоўны алтар, бронзавыя жырандолі, абразы на метале «Дзева Марыя» і «Маці Божая Вастрабрамская» (ХІХ ст.).

З 1793 г. Дзераўная знаходзілася ў складзе Расійскай імперыі. Дзераўной, акрамя Радзівілаў, па чарзе валодалі Абуховічы і Чапскія. У 1897 г. у Дзераўной было 125 двароў, дзе жылі 823 жыхары, значылася аптэка, гарбарня, карчма, 11 крам. У 1866 годзе ў Дзераўной адкрыта народнае вучылішча. У 1900 г. ў вучылішчы навучалася 50 хлопчыкаў і 3 дзяўчынкі. З 1921 г. Дзераўная знаходзілася ў складзе Польшчы, у гэтым жа годзе пабудавана школа-сямігодка. Навучанне вялося на польскай мове. У час вайны гэта школа згарэла. Пасля заканчэння вайны дзеці вучыліся ў некалькіх уцалелых будынках у вёсцы. У 1965-1966 навучальным годзе тут займалася 490 вучняў. У 2007 г. дзяржаўная ўстанова адукацыі “Дзераўнянская сярэдняя школа” была капітальна адрамантавана. Яна як бы ўсміхаецца нам сваімі вачыма-вокнамі. За гады існавання школы сярэднюю адукацыю тут атрымалі каля 3000 чалавек.

Старажылы памятаюць гады Вялікай Айчыннай вайны. У 1943 г. вёска амаль поўнасцю згарэла, а яшчэ раней было вывезена 57 сем'яў яўрэяў (каля 400 чал.). Выконваўся гітлераўскі план ліквідацыі яўрэйскага насельніцтва. Практычна ўсё яно загінула, ыратаваліся адзінкі. Адна з вуліц вёскі названа ў гонар былога дырэктара школы, а ў гады Вялікай Айчыннай вайны – камандзіра партызанскай брыгады «Спартак», якая дзейнічала на Віцебшчыне, А.М. Панамарова. Баявы шлях гэтага чалавека перасякаўся са шляхам П.М. Машэрава. У гады вайны быў таксама растраляны першы старшыня сельскага Савета Ваньковіч Л. Першы помнік загінуўшым землякам быў адкрыты ў 1966 г. У 1973 г. пры актыўнай дапамозе ўдзельніка Вялікай Айчыннай вайны старшыні мясцовага калгаса «Чырвоная зорка» Ф. І. Чэрнікава быў узведзены абеліск. На ім – прозвішчы мясцовых жыхароў, якія загінулі, абараняючы Айчыну. 8 мая 2005 г. ва ўрачыстай абстаноўцы побач з абеліскам была адкрыта мемарыяльная пліта з імёнамі жыхароў Дзераўной і навакольных вёсак, якія былі ўдзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны.

У 1985 годзе пабудаваны спартыўны комплекс “Меліяратар”. Пачала працу дзіцяча-юнацкая спартыўная школа. На вуліцы Набярэжнай знаходзіцца Дзераўнянскі сельскі выканкам, школа

мастацтваў, дзіцячыя яслі-сад. Мясцовая ўчастковая бальніца лічыцца адной з лепшых у рэспубліцы.

Згодна з дзяржаўнай праграмай адраджэння і развіцця сяла на 2005-2010 гг., у канцы 2007 г. вёска Дзераўная стала аграгарадком. Аграгарадок – гэта якасна новы тып сельскага пасёлка, у якім прадугледжваецца стварэнне вытворчай і сацыяльнай інфраструктур для забеспячэння насельніцтва, якое там пражывае, сацыяльнымі стандартамі.

Сёння тут пражывае звыш 1500 чалавек. Для іх паслуг адрамантаваны КБА, сельскі Дом культуры, тры прадуктовыя і адзін гаспадарчы магазіны. Змены адбыліся ў знешнім выглядзе аддзялення сувязі, школы мастацтваў, дзіцячага сада, спартыўнай школы, ашчаднай касы, бальніцы, аптэкі, стадыёна. Поўнасцю заменена абсталяванне тэлефоннай станцыі. Пракладзены новы цэнтральны водаправод і заасфальтаваны ўсе вуліцы.

Хацелася б, каб гэта кропелька гісторыі аграгарадка Дзераўная засталася з вамі, і каб у вандроўках па Беларусі вы ніколі не забывалі свае родныя мясціны і вярталіся на сваю малую радзіму.

ЛІТАРАТУРА

1. Памяць. Гісторыка-дакументальная хроніка Стаўбцоўскага раёна. – Менск: БелЭН, 2004. – 831 с.

УДК 94”1943” (476.4)

Студ. Ю.А. Яхімовіч

Навук. кір. дац. В.М. Астрога

(кафедра гісторыі Беларусі і паліталогіі БДТУ)

## МАКАЎЕ – АХВЯРА АПЕРАЦЫІ “ФРАНЦ”

У гісторыі кожнага краю ёсць свае славутыя і трагічныя старонкі. З самага дзяцінства я ведаю, што Лядзенская зямля (месца, дзе жыве мая бабуля) ў гады Вялікай Айчыннай вайны была сапраўдным партызанскім краем. Восенню 1942 г. у лясах былі размешчаны значныя сілы партызан. 20 кастрычніка 1942 г. была створана партызанкая брыгада “За Радзіму”, якую узначаліў А.К. Флегантаў. Дзейнічалі і атрады В.А. Ціхамірава і В.І. Лівенцава, якія праводзілі баявыя аперацыі на шашэйных дарогах і чыгунках, знішчалі гітлераўцаў, ваенную тэхніку, ваенныя эшэлоны.

Для барацьбы супраць партызан краю фашысты спланавалі карную экспедыцыю, якой далі назку аперацыя “Франц” (Franz). У час падрыхтоўкі да гэтай аперацыі з сярэдзіны жніўня 1942 г. у Чэрвеньскім,